№ 4. Панядзелак, 3 кастрычніка (20 сенцябра) 1921 году. Год I.

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska 9), АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месцы 400 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 75 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 30 польскіх марак

Сябры, не марудзьце з падмогаю „Беларускім Ведамасьцям“, калі ня хочаце, каб газэта зачынілася.

Арганізацыі і сьвядомыя беларусы, дэкляравaўшыя памагаць, успомніце аб сваіх словах.

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

У **Львове** 25 верасьня малады ўкраінскі студэнт Сьцяпан Федак, сын вядомага ўкраінскага дзеяча, тры разы выстраліў у аўтамабіль, у якім ехаў Начальнік Польшчы Пілсудзкі і львоўскі ваявода Грабоўскі. Чацьвёрты раз Федак выстраліў у самаго сябе. Пілсудзкі выйшаў цэлы, Грабоўскі лёгка ранен у плячо, а Федака пабілі да няпрытомнасьці і арыштавалі. „За ўсё тое, што з намі выробляюць“ — гэтыя словы, як прычыну свайго ўчынку, казаў Федак перадаць Начальніку Польшчы Пілсудзкаму, зараз па сваім арыштаваньні. Варшаўскія газэты, абмаўляючы гэты напад, згодна прызнаюць, што меў ён на мэце тое, каб Ліга Народаў зьвярнула увагу на ўкраінскае пытаньне ў Польшчы. Бараніць Федака ўзяліся выдатныя ідэйныя адвакаты-украінцы, як вядомы Лявон Ганкевіч і інш.

Дзякуючы стараньням прадстаўніка ў Лізе Народаў ад Канады, які прыслухаецца да голасу канадзкіх украінцаў, сьледам за справай Віленшчыны і Горнай Сьлезіі патроху выплывае на міжнароднае поле справа Усходняе **Галіцыі**, якая знаходзіцца пад польскім панаваньнем, але за Польшчаю тымчасам ня прызнана. У гэтай справе шукаець для сябе карысьці, як зазвычай, Англія, каторая, можна спадзявацца, і тут зробіць шмат няпрыемнасьці польскім эндэкам, як зрабіла ў справе Горной Сьлезіі і Віленшчыны.

Сойм Незалежнае **Літвы** адкінуў другі праект Гіманса аб развязаньні Польска-Літоўскае спрэчкі, прызнаўшы, як і мы пісалі з самага пачатку, што ў праекце тым ёсьць артыкулы, пагражаючыя незалежнасьці Літоўскае Рэспублікі. Магчыма, аднак, што пасьля пеўных паправак у гэтых артыкулах, калі на іх згодзіцца Ліга Народаў па заявах літоўскага прадстаўніка ў ёй, літоўскі сойм прымець яго, бо ўсё-ж праект прызнае Вільню і Віленшчыну ня Польшчы, а Літве Польшча праектам зусім незадаволена. У Сярэдняй Літве ізноў маюць зьбіраць прадстаўнікоў віленскага магістрату, павятовых і гмінных рад, каб так ці гэтак запярэчыць праекту Гіманса. Што будзе далей, сказаць ізноў дужа трудна. На паседжаньні Лігі Народаў Ашкіназі выясьніў пазыцыю **Польшчы** ў Віленскай справе. Польскі ўрад трымаецца таго, што як толькі насяленьню Віленшчыны будзе загарантована права самаазначэньня, дык армія ген. Жэлігоўскага будзе адразу выведзена.

Унутраная завіруха ў **Нямеччыне** яшчэ ня скончылася, але пасьля зьмены міністраў у Баварыі адносіны гэтай правай старонкі да ўсяе Нямеччыны палепшалі. Нямецкі міністар заграмічных справаў заявіў, што далейшыя вымаганьні хаўрусьнікамі выплаты ня могуць быць споўнены. Спаўненьне нямецкіх забавязаньняў будзе залежаць ад прызнаньня за Нямеччынай усяе **Верхняе Сьлезіі**.

Газэты **Савецкай Расеі** забілі трывогу супроць **Англіі**, якая выслала ноту з дамаганьнем спыніць бальшавіцкую прапаганду ў Індыі.

Паўстаньне ў **Індыі** ня сьціхылася, як паведамілі былі газэты, а яшчэ болей пашыраецца. У ваднэй правінцыі абвешчана каралеўства, незалежнае ад Англіі. На чале яго стаіць індускі сьвяшчэньнік.

Адносіны Англіі да **Ірляндыі** за астатні час пагоршалі. Ізноў згубілася надзея, каб спрэчка ірляндзкіх незалежнікаў, сінфейнераў, з Англіяй скончылася ладам. Перагаворы ірляндзкага прэзыдэнта Дэ-Валеры з старшынёю ангельскіх міністраў Лойд-Джорджам, як ведама, перарваліся і становішча зрабілася няясным.

Вайна **Гішпаніі** з паўстаўшым **Марока** ізноў зрабілася для яе няўдачнаю. Гішпанская армія адступае.

З **Савецкай Беларусі** паведамляюць, што пры выбарах у Гарадзкі Менскі Савет прайшлі 203 камуністы і 45 беспартыйных.

▪▪▪▪

Што за палітыка?

Дэпартамэнт Асьветы Сярэдняй Літвы хоча закрыць старшыя клясы Беларускай гімназіі ў Вільні, пачынаючы ад 5 да 8. Калі-ж бы гімназія не хацела закрыцьця гэтых клясаў, то тады Дэпартамэнт прапануе перавесьці выкладаньне навук у старшых клясах на польскую мову. Чым выкліканы гэты націск Дэпартамэнту Асьветы, мы ня ведаем і ніяк ня можам зразумець. Ці-ж ня дзіўным зьяўляецца вымаганьне Дэпартамэнту пераходзіць на польскую мову ў той час, калі ўсе навукі, апрача (часова) матэматыкі, ў 7-8 кл., выкладаюцца пабеларуску. Выходзіць так, што вучыцца пабеларуску ў старшых клясах гімназіі ня можна,—забаронена. Няма што казаць—дажыліся мы да вельмі добрых часоў!

Угледаючыся наагул ува ўсю асьветную палітыку апошняга часу ў Сярэдняй Літве, нічога ня можна зразумець.

Адчыняюцца расейскія школы з выкладовай расейскай мовай ува ўсіх клясах. Разумеецца, у гэтых школах будуць вучыцца пераважна беларусы. Значыцца, мясцовая ўлада дапушчае русіфікацыю беларусаў і забараняе ім аставацца беларусамі і вучыцца ў сваёй роднай мове.

На тэрыторыі Польшчы практыкуецца такая палітыка ў школьным пытаньні. Была, напрыклад, расейская сярэдняя школа. Школьны куратар перад пачаткам бягучага вучэбнага году папярэдзіў кіраўнікоў расейскіх сярэдніх школ, што ў дзьвюх першых клясах навука павінна выкладацца або папольску, або пабеларуску, і школы перайшлі на беларускую мову. Хоць мы і не згаджаемся з палітыкай, якая вядзецца на беларускай тэрыторыі Польшчы ў адносінах да беларускай школы, наагул, але мусім прызнаць, што школьная адміністрацыя Польшчы ў адносінах да сярэдніх няпольскіх школ выказала некаторую далікатнасьць і рэфарматарскую паступовасьць. Зрусіфікованым вучашчымся старшых клясаў гімназій дадзена магчымасьць вучыцца на расейскай мове, бо польскай мовай яны не валадаюць, а для выкладаньня на беларускай мове не хапае добра падгатаваных вучыцялёў.

А што робіцца ў нас, у Сярэдняй Літве, глаўным чынам у Вільні? То абвешчываецца, што Дэпартамэнтам Асьветы адчыняюцца расейска-польскія гімназіі, у якіх навукі будуць выкладацца на расейскай мове, з паступовым пераходам на польскую, то потым раптам усе навукі ў гэтых школах пачынаюць выкладаць на польскай мове. Даюць концэсіі розным школам, у якіх вучацца ве-расейцы, дазваляючы выкладаць навукі на расейскай мове. А нам, беларусам, забараняюць вучыць у старшых клясах пабеларуску, насупроць волі бацькоў вучашчыхся, самых вучашчыхся і педагогічнага персаналу.

Гэта ёсьць гвалт над нашымі сьвятымі правамі, якога мы неспадзяваліся ні ад якой улады. Гэта ёсьць несправядлівасьць, якой больш не павінна быць. Гэта ёсьць бяссыстэмнасьць у школьнай палітыцы, на якую мы зварочваем увагу ўрадуючых сфэр.

Беларусы, бярыцеся за грамадзкую работу.

У прошлым нумары ў артыкуле „Важны фронт“ я прывёў прыклад, якія вялікія паражкі і няўдачы маем мы затое, што народ наш стаіць далёка ад грамадзкай працы і наагул ад грамадзкіх спраў.

Калі-б у „калідоры“, дзе, апроч жыдоў па мясьцечках, амаль ні выключна жывуць адны беларусы, калі-б там гмінныя ўпраўленьні знаходзіліся у руках сьвядомых і шчырых беларусаў, то нам шмат лягчэй было б абараніць свае пачатковыя школы.

Тое-ж самае можна сказаць аб усіх часьцінах парэзанай суседзямі нашай бацькаўшчыны.

У Віцебшчыне, Магілеўшчыне і Смаленшчыне наша родная культура ня была-б у такім упадку каб там болей было нашых рухавых, сьвядомых працаўнікоў, якія прывярнулі-бы народ, навет пад маскоўска-бальшавіцкім панаваньнем, да сваіх грамадзкіх спраў.

У Летгаліі, часьці Латышскай рэспублікі, істнаваньне нашай школы, можна сказаць, залежыць толькі ад самых беларусаў, бо латышскі ўрад адносіцца надта прыхільна да разьвіцьця беларускае культуры. Праўда што — там цяпер беларусы шмат чаго зрабілі і робяць.

Аб Савецкай Беларусі, пакуль што, ня будзем нічога казаць, бо пры ўсім бязладзьдзі і пры залежнасьці ад маскоўцаў, там сёлета скрозь заведзены школы на беларускай мове, адчыніўся беларускі унівэрсытэт і многа чаго іншага, дужа памыснага, зрабілася для нашае культуры.

Найгорш стаяць нашы справы ў беларусаў пад Польшчаю і ў Сярэдняй Літве.

Аднак, тут ня можна адно толькі наракаць на дрэнных польскіх начальнікаў, бо ў многім вінаваты мы самі.

Будзем спачатку гаварыць аб Польшчы. Там беларусы ня маюць ніякой вагі ў грамадзкім жыцьці, хоць набярэцца іх за міліён... Няма там моцных беларускіх арганізацый, ня выходзіць ніводнай нашай газэты, блізка што зусім няма беларускіх школ, у гмінах сядзяць ня нашы людзі, праваслаўнае духавенства справядліва наракаець на цяжкую долю. Тымчасам, беларускі народ там усё як-бы чаго чакаець, не бярэцца да арганізацыі і ані зусім не ведае, аб сваіх правох, як нацыянальнай меншасьці, прадугледжаных канстытуцыяй Польшчы і гарантованых Версальскім трактатам.

І ад гэтага вы ходзяць нязьлічоныя беды і крыўды.

Так далей не павінна быць.

Няма што чакаць невядома чаго, трэба лічыцца з тым, што ёсьць. І наагул арганізацыя ніколі не пашкодзіць і заўсёды, пры ўсякіх варунках яна патрэбна і ў ёй найлепшы ратунак.

Што-же павінны рабіць цяпер беларусы пад Польшчаю?

Перш-наперш яны павінны ў сваім краі ўзяць у свае рукі валасныя, ці гмінныя ўпраўленьні. Гэта будзе падваліна, апора ўсякіх іншых культурных арганізацый. Дагэтуль беларускі селянін стараніўся ад грамадзкае работы, кожны баяўся высунуцца наперад, каб ня страціць спакой жыцьця. Разумеецца, на гэта былі пеўныя прычыны. Калі-ж хто з гарачым сэрцам справядлівага чалавека і сумленнага грамадзяніна й выскаківаў на перад, то ён ня чуў за сабой грамадзкай сілы, ня меў паддзержкі. Наадварот, цёмныя, забітыя людзі, разьбегшыся ад яго няшчасьця, як вераб'і, навет яшчэ зларадствавалі: „А што? Выскачыў? Папаўся!“ А таго ня ведалі, што затое пападаюць яны ў нягоднае кіраўніцтва чужых іхным інтарэсам людзей і горка пакутуюць.

Калі будуць добра арганізованы хоць-бы нашы валасныя, ці гмінныя упраўленьні, то можна спадзявацца, што беларусы пад Польшчаю здолеюць правесьці і сваіх добрых дэпутатаў у польскі сойм. А зрабіць гэта — значыцца, выйці з становішча „быдла“, як любяць казаць на нас паны, і зрабіцца арганізаваным, моцным, паважаным для прыяцеляў і страшным для ворагаў народам. За ўсякую крыўду і зьнявагу беларускаму народу яго запраўдныя прадстаўнікі - дэпутаты будуць голасна пратэставаць у сойме і вымагаць кары крыўдзіцелям і зьняважнікам. Яны будуць бараніць ня толькі родную культуру, ня толькі нашы духоўныя інтарэсы і правы, але і эканамічныя патрэбы. А цяпер хто іх абароніць, хто скажа так, што мусяць прыслухацца і пачуць? Хто цяпер бароніць правы нашых уцекачоў на падмогу, сялян на зямлю і розныя багацьці свайго краю? — Ніхто!

Покуль тое што, было-б надта патрэбным склікаць ўсебеларускі зьезд беларусаў Польшчы і арганізаваць Нацыянальную Раду, якая кіравала-бы нацыянальным і культурным жыцьцём польскіх беларусаў і ў разе патрэбы выступала-б перад польскім урадам ці навет перад Лігай Нацый.

Польскія немцы так ужо зрабілі. А мы?

Нашы дзеячы-паланафілы, на сваю вечную ганьбу і сорам, дагэтуль яшчэ займаюцца сваёй дробненькай палітыкай, ці лепей кажучы — абывательскім палітыканствам, абібаюць розныя вартыя і нявартыя парогі, а заняцца важнай памененай справай... ня сьмеюць, не адважуюцца! Не адзін з іх наіўна і жалка прызнаваўся мне ў гутарцы, што яны не спадзяюцца, каб іхныя прыяцелі і пакравіцелі дазволілі ім на гэта.

З тых слоў наш народ пад Польшчаю павінен зразумець, што на такіх дзеячаў слабая надзея, што трэба самім высунуць з-паміж сваей народнай інтэлігенцыі і з-паміж лепшых сялян такіх людзей, якія возьмуцца за справу! Такія людзі ёсьць, толькі хай яны ўжо кінуць ухіленьне ад грамадзкае работы, хай зразумеюць, што час прыйшоў. Моральную помач ім могуць аказаць у першы чарод некаторыя віленскія беларускія арганізацыі і дзеячы.

Што датыча Сярэдняе Літвы, то тут у зьвязку з палітычным мамэнтам, справа беларускае арганізацыі нязвычайна дасьпела і вымагае найбарджэйшае і найпільнейшае падгатоўкі. Бо ў адзін прыгожы дзень няяснае становішча можаць скончыцца, і беларусы павінны будуць паказаць усе свае адміністратыўныя, культурна-нацыянальныя, і наагул грамадзкія сілы і здольнасьці.

Сіл у нас хваціць. Мы, запраўды, адна з культурных і духоўна багатых нацый.

Але што-ж, калі сілы нашы будуць расьцярушаны, ня зьвязаны, не падлічаны, адны адным невядомы?

Праўду кажучы, Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт да гэтай пары ці ня мог, ці не хацеў, ці ня ўмеў што-небудзь зрабіць у гэтым кірунку. Ен навет, гэта сьмешна і прыкра гаварыць, свайго ўласнага памяшчэньня да гэтае пары ня прыдбаў сабе. Аб чым думаець, якія пляны строіць ягоны старшыня — Бог яго сьвяты ведае. Не хачу, ведаючы цяжкія палітычныя варункі, не хачу зьняважаць нашага нацыянальнага бацьку, але самай маленькай крытыкай тут усё можна перавярнуць да гары нагамі.

Адна уцеха: у Сярэдняй Літве мы маем значныя кадры нацыянальна-культурных працаўнікоў, якія заўсёды паднясуць справу да належнай вышыні.

Але ці не пара-б была як мае быць завінуцца ля работы?

Ці не пара-б было весьці работу з плянам, абдумана і арганізована?

Адчым словам, бярыцеся, беларусы, усёю грамадою за работу. Годзе толькі наракаць на ворагаў, — агляніцеся на сваё нядбальства.

Дзед Кузьма.

✦✦✦

Што чуваць у сьвеце?

Сьмерць баўгарскага пісьменьніка.

У сталіцы Баўгарыі—Софіі памёр слаўны нацыянальны баўгарскі паэт і пісьменьнік Іван Вазаў. Ен меў 75 гадоў. Творы Вазава мелі такое-же значаньне для баўгарскага адраджэньня, як творы Ф. Багушэвіча для нашага.

Набор у Варшаве.

У Варшаве расклеена абвешчаньне аб прызыве навабранцаў гадоў 1899 і 1900.

Голад у Карэі.

Вялікая суш зьнішчыла нівы карэйцаў, дзеля чаго пачаўся голад сярод двух міліёнаў манджурскіх карэйцаў. Большасьць галадуючых жывець каля Мукгдэна.

Безрабоцьце ў Амерыцы.

Амерыка маець вялікую армію безработных. У Амерыцы цяпер болей 6.000.000 чалавек без работы, бяз спосабу на істнаваньне. Болей пaўміліёна безработных у Нью-Іорку. Дарэмна ўсе яны бегаюць што дзень, шукаючы работы; кожны дзень яны варочаюцца пасьля доўгіх шуканьняў зморaныя, галодныя, праклінаючыя долю.

(„Американския Известия“)

✦✦✦✦

АГЛЯД ДРУКУ.

Самазначэньне Віленшчыны па рэцэпту п. Яна Обста.

У зьвязку з другім праектам Гіманса пеўныя колы віленскага грамадзянства цяпер згодна і рупліва загутарылі аб «волі людносьці», аб самаазначэньні, так сказаць, нашага краю. Але ў якой абстаноўцы спадзяюцца зрабіць гэтае самаазначэньне віленскія польскія эндэкі, відаць хоць-бы з артыкулу тутэйшага борзапісца з «Жэчып.» п. Яна Обста. Пан Обст накінуўся на Дырэктара Дэпартамэнта Асьветы п. Ліхтаровіча за яго газэтнае выясьненьне ў справе Літоўскай гімназіі ў Вільні. Пан Обст, між іншым, пішаць (№ 218):

„У гэтую мінуту, калі ўся літоўская прэса адкрыта заклікае да вайны з Польшчаю, (?—А.М.), калі вайна тая запраўды вісіць на валасіны,—добрае рахаваньне, хоць-бы ў прапягу аднэй гадзіны, з гняздом п. Біржышкі (дырэктара Літоўскай гімназіі— А. М.) у Вільні ёсьць непараўнаванай з нічым лёгкадумнасьцю, ёсьць гуляньнем з цярплівасьцю нашага (мабыць, эндэпкага—А. М.) грамадзянства. Тут по-мала высяленьня з будынку на Лукішках, бо адзіным памысным распараджэньнем было-б тое, што год таму назад зрабіў ген. Жэлігоўскі з акупацыйным літоўскім урадам: усадзіць п. Біржышку з яго гімна-

зіяй у цягнік і выслаць у Коўню...паскольку відочна ў сучасных варунках ўлады нашы не ўважаюць болей намысным зьмесьціць яго з цэлым штабам (мабыць, усімі віленскімі ліцьвінамі — А. М.) ў концэнтрацыйным лагеры"...

Разумеецца, калі падгагаваць абстаноўку для самаазначэньня Віленшчыны па рэцэпту п. Обста, самазначэньне тое зробіцца толькі камэдыяй для апуканьня Лігі Народаў. Але ня думаем, каб польскае грамадзянства краю дзякавала такому мудраму палітыку і ў сучасны мамэнт за падобныя рады. Бо яно мае поўнае права сказаць яму: „Паслужлівы пан Обст — страшней за ворага!"

А. М.

З літэратурнай хрыстаматыі.

З перапіскі невядомага беларускага аўтора.

(Ліст пісаны 11 лютага 1564 г.)


Аб польскіх замахах на незалежнасьць Літоускага гаспадарства. Панове Ляхове дівнымі а рознымі претекстамі хотелі, жебы Літву у кабалу запісалі і у вечную неволю собе нас' взялі; напервей, одное ляскі, одное печаті, одного скарбу, одное канцелярей доііраліся; потом', кгды того довесті не моглі, тогды предься, жебы всі тые станове і врядніки Літовскіе пісаліся «маршалок' земскій коруны Польское у веліком' князьстве Літовском», потомуж' і іные всі врядніки Літовскіе, а король жебы ся пісал' «король Польскій і і земль князьства Літовского», чого кгды теж, довесті не моглі, тогды предься то нам' отнімають, чого ім' Боже не поможі, абы зараз' в'Польші на велікое княство подношенье было, а в' Літве жебы ніколі на князство подношенье не было. Потомуж' і о соймы, абы соймы вальные через' то в' Літве не былі, только спольные з' німі на граніцах'; чого панове послове наші, дай пане Боже, абы боронілі, якож' есть і надея в' Бозе, штож' і оборонят'...

претекстамі—пратэкстамі, прычынамі, падходамі
жебы—каб
ляскі—дзяржаунага кія, скіпетру
скарбу—фінансау, грошы
канцелярei—дзяржаунага дзелаводзтва
кгды—калі
предься—перад гэтым, спачатку
подношенье—карапацыя
спольные—супольныя, сумесныя

К 400-лецью друку у Вільні.

Мы ўжо пісалі, што Вільня мае рыхтавацца к вялікай урачыстасьці, якая наступаець для яе у 1925 годзе. Покуль што, краёвыя газэты мала аб гэтым пішуць. А варта-б было ужо падумаць, якім чынам адзначыць вялікае сьвята. Праўда, ваенны час і палітычная абстаноўка перашкаджаюць грамадзянству парупіцца навет у такой важнай культурнай справе, але ўсёжткі трэба нешта зрабіць для ушанаваньня памяці слаўнага пісьменьніка, дзеяча і першага віленскага друкара Францыска Скарыны. Пара ўжо падумаць, ці ня можна-б было паставіць яму памятнік у Вільні ці хоць прыбіць дошку з належным напісам. Вучоныя, не паралізаваныя нацыянальнай непрыязьню, мусяць паклапаціцца з устанаўленьньем, хоць прыблізна, дзе была друкарня Ф. Скарыны, або дзе наогул найлепей выпадае зрабіць яму відную памятку ў Вільні? Віленскія працаўнікі слова і грамадзкія дзеячы мусяць ужо закласьці нейкі гурток з той жа мэтаю.

Ніжэй мы зьмяшчаем прыклад друку „Апостала" Ф. Скарыны, выданага ў Вільні ў 1525 годзе.


ПОСЛАНИЯ:~
Доконания є сия книга зовемая апостол, еже замыкае всобе наипервей деяния апстльская. Потом посланией светых апостол, соборных седм:~ Тяж епистол светого павла ді:~ Лета по нарожении нашего спасителя іса христа сына божия. тысещнаго, пятьсотаго, и двадесеть пятого. Месеца марта:~ Придержании наласкавшего господаря Жикгимонта Казимировича, Короля полского. И великого князя литовского, и руского, и жомойтьского и иных. Во славном месте виленском выложена, и вытиснена. Працею и великою пилностию. Доктора франциска скорины сполоцка:~ Богу вотроици едином. И пречтой матери его марии, со всеми светыми кочьти. И людем посполитым кдоброму навчению:~

„Апостал" Ф. Скарыны.

Чытаецця так: Пасланія:—Доконана е сія кніга зовемая апостол', еже замыкае в собе найпервей деянія апстльская. Потом' посланіей свтых' апостол', соборных седм':—Таж' епістол' светого павла 14:—Лета по нароженіі нашего спасітеля іса хрста сына божія тысешчнаго, пятьсотаго, І двадесеть пятого. Месеца мар'та:— Прі держаніі наласкавшего господаря Жікгымонта Казіміровіча, Короля пол'ского. І велікого к'нязя Літовскаго, І рускаго, І жомойтьскаго І іных'. Во славном' месте віленском' выложена, і вытіснена. Працею і велікою піл'ностію. Доктора франціска скоріны с полоцка: — Богу во троіці едіному. І пречтой матері его маріі. со в'семі светымі ко чьті. І людзем' посполітым' к' доброму навченію: —

Ніколі гэтаму ня бываць!

Як у расейцаў у Маскве ці ў Яраслаўлі, у палякоў — у Варшаве ці ў Кракаве, так у нас у Вільні, у Менску і ў другіх местах ёсьць свае нацыянальна-рэлігійныя сьвятыні.

Да такіх вялікіх беларускіх сьвятынь, належыць, бязумоўна, Сьвята-Троіцкі манастыр у Вільні.

З месцам манастыра зьвязана сьмерць першых праваслаўных беларускіх мучанікаў у Вільні: Антонія (Няжылы), Іоана (Кумца) і іх родзіча Астапія.

Манастырская царква была збудована нашым князем Канстантынам Астрожскім у памяць знамянітай пабеды беларусаў пад маскоўцамі пад Воршаю ў 1514 годзе.

Пад царквою і ля царквы знайшлі вечны прыпын з сваімі сем'ямі многія слаўныя беларускія дзеячы, праваслаўныя і уніяты, як бурмістр Брага з сынам, Тышкевічы, Корсакі-Галубіцкія і інш.

У даўнейшых мурох манастыра, як ёсьць пеўныя здогады, зьмяшчалася і знамянітая друкарня беларускіх мецэнатаў і грамадзкіх дзеячаў братоў Кузьмы і Лукаша Мамонічаў, бышая раней вялікага беларускага мужа Францыска Скарыны. І калі дзе рабіць памятку 400 лецьця нашага друку, то найбольш годнае месца — муры Сьвята-Троіцкага манастыра, Базыліянскія муры.

З гэтымі-ж мурамі зьвязана жыцьцё і дзеяльнасьць беларускага-уніяцкага сьвятога (родам украінца) Іосафата Кунцэвіча,—праўда, замучанага беларусамі-ж, але ці-ж мала маскоўцаў, замучаных маскоўцамі, і палякоў, замучаных палякамі?

Манастыр быў спрадвеку праваслаўны, потым уніяцкі, потым ізноў праваслаўны, але ніколі ён ня быў каталіцкім. Ен заўсёды быў беларускім, ніколі ня быў польскім і па складу большасьці сваіх манахаў не зрабіўся расейскім навет у самыя страшныя часы русіфікацыі. Ні паланізацыя ў астатнія часы уніі на Беларусі, ні русіфікацыя, запанаваўшая пасьля яе гвалтоўнага скасаваньня ня сьцёрлі з высока-мастацкай, у беларускім стылю зробленай надгробнай пліты праваслаўнага віленскага бурмістра - беларуса Апанаса Брагі, ня сьцёрлі з яе напіса аб нашай слаўнай мінуўшчыне ў Вільні.

Праўда, мінуліся тыя даўныя часы, калі ў віленскім магістраце засядалі амаль ні выключна беларусы, напалову каталікі і праваслаўныя, мінуўся час Апанаса Брагі, але вечная памятка ў Сьвята-Троіцкай царкве і цяпер кажа, што манастыр быў і павінен быць беларускім.

У гэтым-жа манастыры жыў вядомы Іпацій Пацей — уніят, але не паляк і не масковец, а сьвядомы беларус, пісаўшы кнігі свае пабеларуску і ў беларускім духу і друкаваўшы іх старабеларускімі літарамі.

Праўда, уніяты-базыліяне з часам карысталіся і польскаю мовою, жывучы ў Рэчыпаспалітай Польскай, але-ж яны не пераставалі быць беларусамі, як і мы не перастаём быць беларусамі, ужываючы ў тых-жа выпадках і з тых-жа прычын ня толькі родную, але й польскую ці маскоўскую мову.

Ад гэтага архітэктурная разьвязка Сьв.-Троіцкай царквы не перастае быць чыста-беларускай, як не зьмяншаецца значаньне для нашай культуры высока мастацкай брамы ці званьніцы манастыра.

Навет у часе самай ліхой русіфікацыі з муроў манастыра, зьмяшчаўшых праваслаўную сэмінарыю, выходзілі нашы людзі, як, да прыкладу, сучасны беларускі дзеяч, прафэсар Менскага Беларускага Педагагічнага Інстытуту, вядомы аўтор „Гісторыі Беларусі" Усевалад Ігнатоўскі, беларускі працаўнік Імшэньнік і многія другія.

І нам гэтыя муры хочуць адабраць!

Знаходзілі розныя прычэпкі. Не пасароміліся навет зьняважыць вялікае і дарагое і для нас імя генія нашага краю Адама Міцкевіча...

Калі-ж усе прычэпкі ганебна правалiліся, ворагі беларусаў вуснамі цёмных жанчын-трэцярак проста прызналіся, чаго яны хочуць: выкінуць з муроў беларусаў з усімі іхнымі ўстановамі, перавярнуць беларускую праваслаўную царкву не на беларускую уніяцкую царкву і не на беларускі каталіцкі касьцёл (чаго беларусы-каталікі ніколі ня зробяць!), але проста на польскі каталіцкі касьцёл, а ў муры, дзе цяпер наша гімназія, усадзіць пана архіварыуса Студніцкага, ворага ўсяго, што беларускае, з яго архівамі.

Але хай ворагі беларушчыны ведаюць, што ніколі гэтаму ня бываць, покуль ёсьць на сьвеце хоць маленькі сьцень праўды і справядлівасьці і хоць адзін сьвядомы беларус.

А. Мсьціслаўскі.

Аб 1-й Віленскай Беларускай Гімназіі.

Надоячы ў Дырэктара Дэпартамэнта Асьветы Сярэдняе Літвы п. Ліхтаровіча была беларуская дэлегацыя ў складзе: старшыні Таварыства Беларускае Школы А. Смоліча, старшыні Бацькаўскага Камітэта 1-й Вілен. Бел. Гімн. п. Акушкі і прадстаўніка Педагогічнай Рады той-жа гімназіі М. Гарэцкага.

Дэлегацыя хадзіла з прычыны таго, што за колькі дзён перад гэтым рэферэнт беларускіх школ пры Дэпартамэнце п. Тарашкевіч паведаміў гімназію, што Дэпартамэнт дасьць далейшы дазвол на істнаваньне поўнай гімназіі толькі ў тым выпадку, калі чатыры старэйшых клясы будуць пераведзены на польскую мову.

Той-жа п. Тарашкевіч у чэрвені месяцы г.г. казаў гімназіі толькі тое, што на гэтыя клясы Дэпартамэнт ня дасьць грошы, калі гімназія ня здолее перайсьці з восені на выкладаньне ўсіх навук у беларускай мове.

Гімназія, Т-ва Беларускае Школы і наагул беларускія школьныя працаўнікі, маючы той пераход за мэту ўсяе свае работы і шмат зрабіўшы для яе спраўджаньня раней, улетку выпаўнілі вялізную працу, даўшую поўную магчымасьць для пераходу. Напісаныя і перакладзеныя падручнікі, якіх да той пары не хапала, былі ў працягу лета надрукованы коштам пазыкі, дадзенай Белар. Навуковаму Таварыству з сьпецыяльна гэтай мэтай тым-жа Дэпартамэнтам Асьветы. Па ўказах прадстаўніка Дэпартамэнта Асьветы п. Тарашкевіча была праведзена поўная рэформа навучаньня ў гімназіі па прыкладу гуманістычнага тыпу польскіх школ. Па загаду Т-ва Беларускае Школы былі зроблены перавыбары усіх вучыцялёў гімназіі,прычым некаторыя ранейшыя педагогі ўжо не ўвайшлі ў новы склад, некаторыя ня былі ім зацьверджаны, і ў рэзультаце гімназія папоўнілась новымі беларускімі педагогічнымі сіламі і такімі выдатнымі, як доктар філёзофіі кс. Бобіч, б. дырэктар беларускай вучыцельскай сэмінарыі С. Рак-Міхалоўскі, малады вучоны-філёлёг, аўтор белар. школьнай граматыкі Б. Тарашкевіч, б. прафэсар Менскага Педагогічнага Інстытуту п. А. Трэбка, б. інспэктар гімназіі і вядомы школьны беларускі працаўнік п. Краскоўскі і інш.

Гімназія была пеўна, што яе далейшае нормальнае разьвіцьце зусім забасьпечана, і таму прапазыцыя перавесьці чатыры старэйшыя клясы на польскую мову зьявілася для яе поўнай і незразумелай неспадзяванкай.

З перагавораў дэлегацыі з п. Дырэктарам Дэпартамэнту выясьнілась, што немагчымая і крыўдная для беларускага грамадзянства прапазыцыя ёсьць рэзультатам даўнейшых паглядаў п. Дырэктара на беларускую гімназію ў Вільні, зьвязаных з тым, што летась некаторыя навукі ў старэйшых клясах гімназіі, глаўным чынам матэматыка, вакладаліс дзеля адсутнасьці друкаваных беларускіх падручнікаў — парасейску. Каб змагчы „русіфікацыю", як сказаў п. Дырэктар, ён пастанаўляе перавесьці чатыры старэйшых клясы гімназіі на польскую мову.

Дэлегацыя заявіла п. Дырэктару Дэпартамэнта, што беларусы ня хочуць вучыцца ні на польскай, ні на якой іншай чужой мове, а толькі на сваёй роднай—беларускай. Калі-ж ім прыходзілася карыстацца чужой мовай, то не па іх віне. Змаганьне-ж з русыфікацыяй у даным прыпадку зьявіцца якраз падмогай ёй і змаганьнем з беларушчынай, бо вучні тых клясаў папольску вучыцца ня могуць і са шчэмленым сэрцам пойдуць з беларускай гімназіі ў атрымаўшыя концэсіі расейскія школы ў Вільні.

Восень.

Як ня любіць мне восень залатую,
Калі праз вопратку асін густую
Тон прабіваецца чырвоны,—слаўны тон.
І ў золаце стаіць маўклівы, пышны клён...
Як ня любіць мне восень залатую,
Калі на ніву зжатую, пустую
Кладзецца у начы, як малако, туман
І павучыньня шмат на хмызьняку палян...
Як ня любіць мне восень залатую,
Як ня любіць мне частку года тую,
Калі я веру ўсім, калі душа гарыць
І хочацца ўвесь час, хоць сумаваць, а жыць.

1921. Натальля Арсеньнева.

Самае кароткае апавяданьне.

Убогая хата, сягоньня падмеценая і цёплая.

На левай ад дзьвярэй лаўцы, вузкай — як звычайна, ляжыць нябожчык-мужчына. З рэдкай бародкай рудымі жмуткамі; склычанымі дзікімі валасінкамі,таксама жоўта-рудымі—на вуглох сашчэмленага, сіняватага роту. Худы, жоўты, у шэранькім жупане, белых альняных штанох і ў новых лапцях. Ня дужа даўгі, хоць ляжыць. І рукі на грудзёх сашчэплены.

На палу сядзяць у сьвітках дзьве старыя бабы і маўчаць. Я—за сталом над псалтыром шапчу і паглядаю з-пад ілба.

Жонка над нябожчыкам выець і прыгаварывае. Болей нікога ў хаце.

А мой жа ты сакалочак,
А мой-жа ты галубочак!
Ты мяне любіў
І я цябе любіла,
А сьмерць нас разлучыла...
А што-ж мне рабіць,
А што-ж мне рабіць?...

Гарэлкі па беднасьці няма, і хаўтуры нудныя. Нудна бабам, нудна й мне. Навет жонка якбы нудна вылічае:

Ты мяне любіў
І я цябе любіла,
А сьмерць нас разлучыла..

Добра, што ў іх дзяцей няма: усе паўміралі.

Максім Гарэцкі.

24/IX—1921 г.

Статут Таварыства Беларускае Школы.

1. Назоў, мэта і месца быцьця Таварыства.

§ 1. Таварыства завецца „Таварыства Беларускае школы" і мае мэту пашыраць і памагаць асьвеце ў беларускім нацыянальным, людзкім і хрысьціянскім дусе.

§ 2. Таварыства стаіць вонках усіх палітычных партый і кірункаў; адзінай яго задачаю ё разьвіцьцё беларускіх школ і беларускае асьветы наагул.

§ 3. Дзеля правядзеньня ў жыцьцё мэты, азначанае ў § 1, Таварыства, паміж іншым, мае права: 1) закладаць, удзержываць і паддзержываць: а) народныя школы, б) курсы для выраслых няпісьменных, в) прыпынкі, г) вучыцельскія сэмінарыі, школы ўзгадавацелек, народныя чытальні і кніжніцы (бібліатэкі) д) школы вышэйшыя і сярэднія ўсялякіх тыпаў;

2) закладаць народныя дамы дзеля асьветы і таварыскае гульні.

3) арганізаваць лекцыі і курсы;

4) выдаваць і пашыраць беларускія школьныя кнігі (падручнікі), навуковыя, пэдагогічныя і народныя газэты;

5) даваць вучням і вучаніцам стыпэндыі, падмогі і розную навуковую помач;

6) рабіць праекты будоўлі школ і школьных ўпарадкаваньняў і мае нагляд над іх выпаўненьнем;

7) абвяшчае конкурсы, патрэбныя дзеля дапяцьця мэтаў „Таварыства Беларускае Школы".

§ 4. Месца быцьця Цэнтральнае Рады Таварыства ё места Вільня.

§ 5. Таварыства ё юрыдычнаю асобаю, можа мець розную рухомую і ляжачую маемасьць, а гэтым самым купляць і прадаваць ляжачую маемасьць

2. Маемасьць Таварыства.

§ 6. Маемасьць Таварыства складаецца:

1) з месячных складчын сяброў (сяброvак),

2) $1\frac{1}{2}$ % адлічаю месячнага заробку сяброў (сяброvак):

3) з самахвотных ахвяр;

4) з дараў і запісаў;

5) з даходаў з курсаў, лекцыяў і навуковых гутарак:

6) з працэнтаў ад зялезнага капіталу;

7) з іншых непрадбачаных прыходаў.

§ 7. Зялезны капітал складаецца:

1) з скарбаў адумысьля на гэта ахвяраваных;

2) з скарбаў, што асыгновуе на гэта Агульная Вялікая Зборка.

§ 8. Рада Таварыства вядзе рахунковасьць паводлуг правіл права і звычаяў.

3. Правы і абавязкі Сяброў.

§ 9. Сябрамі Таварыства могуць быць як фізычныя асобы бяз розьніцы полу, так і асобы юрыдычныя і ўстановы.

§ 10. Сябры Таварыства дзеляцца на памагаючых, запраўдных і пачэсных

Сябрам памагаючым можа быць кожная фізычная і юрыдычная асоба, або таксама група людзей, што выплачуе на мэты Таварыства прынамся пяць (5) марак у месяц.

Сябрам запраўдным можа быць кожная фізычная і юрыдычная асоба, або таксама група людзей, што выплачуе на мэты Таварыства $1\frac{1}{2}$ % свайго месячнага заробку.

Сяброў пачэсных назначае Агульная Вялікая Зборка на прадстаўленьне Цэнтральнае Беларускае Школьнае Рады, як прызнаньне асаблівых заслуг на ніве беларускае асьветы.

Увага: Беларускія вучыцялі (кі) Сябры Беларускага Вучыцельскага Саюзу, калі ўзносяць у свой саюз $1\frac{1}{2}$ % свайго месячнага заробку, прымаюцца ў Сябры „Беларускае Школы" бяз ніякіх складчын і адлічак.

§ 11. Запраўдныя сябры таварыства маюць права прымаць учасьце ў дзейнасьцях гуртка, да якога належаць і галасаваць на зборках гэтага гуртка, прадстаўляць і паддзержаваць на зборках гэтага Гуртка ўсе прапанаваньні, што скіраваны да правядзеньня ў жыцьцё мэтаў Таварыства ў межах дазволеных уставам, абіраць і быць абранымі.

Пачэсныя Сябры маюць права прымаць учасьце ў Агульнай Вялікай Зборцы, калі залічаны да якога Гуртка; карыстаюць з правоў запраўдных Сяброў, без абавязку плаціць % адлічку.

§ 12. Сябра можа заўсёды выступіць з Таварыства, адылі абавязаны наказаць аб гэтым пісьменна Радзе Гуртка. Сябра, што ня выплаціў месячнае сяброўскае складчыны, або месячнае % адлічкі можа быць выкасаваны з ліку Сябраў Т-ва на пастанове Рады Гуртка, калі ня глядзячы на пісьменны спамінак належных грошай не аддае, або калі яго меспабыцьце няведама. Выступленьне або выкасаваньне, з ліку Сяброў не аслабаняе выступаючага або выкасаванага ад павіннасьці заплаціць складчыны або % адлічку за той месяц, у якім захацеў выступіць або быў выкасаваны. Таксама ён павінен аддаць усе ранейшыя даўгі.

§ 13. На прапанаваньне Рады Гуртка можа Цэнтральная Школьная Рада паставіць выключыць Сябру, калі ён шкодзіць Таварыству, або зробіць пастунак праці грамадзянскага гонару.

4. Гурткі і Акружныя Школьныя Рады.

§ 14. Гурток арганізуецца дзеля правядзеньня ў жыцьцё аднаго або болей заданьняў, нацемленых у ўставе Таварыства.

Гурток можа арганізавацца на аснове гэтага статуту ў кожнай мясцовасьці, у якой захоча арганізаваць Гурток прынамся 10 чалавек, як Сяброў запраўдных, калі акружная Школьная Рада прызнае патрэбным арганізаваць Гурток. На чале кожнага Гуртка стаіць Рада, якую абірае агульная Зборка Сяброў Гуртка.

§ 15. Гурткі злучаны ў Вокругі, якіх лічба і прастор дзейнасьці па прадстаўленьню Гурткоў азначае Цэнтральная Школьная Рада.

На чале кожнага Вокругу ё Акружная Школьная Рада, якую абірае Акружная Зборка, што складаецца з дэлегатаў усіх Гурткоў данага Вокругу.

§ 16. Агульныя Вялікія Зборкі ўсіх Гурткоў і Вокругаў згукаваюць Рады тых-жа Гурткоў і Вокругаў—звычайныя раз у год, надзвычайныя — у меру патрэбы. Арганізацыю Гурткоў і Вокругаў, межы іх компэтэнцыі ды спосаб зносін з Цэнтральнаю Школьнаю Радаю азначыць інструкцыя, зацьверджаная Агульнаю Вялікаю Зборкаю Таварыства або з паўнамочча Агульнае Вялікае Зборкі Цэнтральная Школьная Рада разам з Нагляднаю Радаю

5. Цэнтральная Школьная Рада.

§ 17. Цэнтральная Школьная Рада складаецца з 7—12 Сяброў, якіх абірае Агульная Вялікая Зборка на тры гады.

Апрача гэтага, Агульная Вялікая Зборка абірае 4 заступнікаў, якія пераймаюць абавязкі Сяброў Рады, калі Сябры выступяць да року, або ня могуць пераз даўжэйшы час спаўняць сваіх абавязкаў.

§ 18. Сябры Цэнтральнае Школьнае Рады

Урэшце делегацыя спыталася ў п. Дырэктара Дэпартамэнту, чаму не выдаецца, як раней, падмога на малодшыя клясы (якія Дэпартамэнт ня думае пераводзіць на польскую мову), бо вучыцялі ўжо трэці месяц не дастаюць пэнсіі. Пры гэтым высьвятлілась нейкае непаразуменьне, бо п. Дырэктар сказаў, што на гэтыя клясы гімназія павінна была даставаць грошы і зараз можаць дастаць.

Што датыча просьбы аб выдачы концэсіі на ўсю гімназію, то пытаньне аб старэйшых клясах, ня гледзячы на ўсе довады дэлегацыі, засталося неразьвязаным. Дырэктар Дэпартамэнту п. Ліхтаровіч, гаварыўшы спачатку, што старэйшыя клясы будуць на польскай мове або зачыняцца, пасьля гутаркі з дэлегацыяй згодзіўся ў бліжэйшыя дні пераглядзіць зробленую пастанову і афіцыяльна паведаміць аб рэзультаце.

Будзем спадзявацца, што справа не абвойстрыцца.

Усё беларускае грамадзянства прыймаець яе нязвычайна блізка да сэрца, як грунт усяго свайго нацыянальна-культурнага разьвіцьця, і будзе бараніць сваё сьвятое права на родную школу да астатку.

М. Гарэцкі

Як нас адукуюць.

У горадзе Нясьвіжы (цяпер павятовы горад са Старостввам) да вясны гэтага году існавала былая міністэрская жаноцкая гімназія. Улетку былі зроблены заходы прад адпаведнымі ўладамі, каб аднавіць заняткі з пачатку школьнага году, прычым гімназія пераіменавалася у прыватную п. Жаўнаркевіча. Улада адмовіла у адкрыцьці поўнай гімназіі з выкладовай моваю расейскай і прапанавала адкрыць пераходную гімназію з 1 і 2 клясамі польскімі, а рэшта з выкладовою моваю расейскай, з тым, каб кожны год прыбаўлялася паступова адна польская кляса як гэта, ня ў прыклад кажучы, згадзілася другая Нясвіская гімназія, на чале якой і да гэтага часу стаіць вядомы чыноўнік-футляр, цяпер ужо паланізатар п. дырэктар Палівода.

Тады кіраўніцтва жаноцкай гімназіі стала прасіць, каб дазволілі адчыніць гімназію з першымі дзьвума клясамі беларускімі, да якіх бы паступова з кожным годам прыбаўлялася усё новая і новая кляса, а расейскія клясы з кожным годам змяншаліся-б, і гімназія праз колькі гадоў перашла-бы ў беларускую.

Улада здаволіла просьбу, дазволіла адчыніць гімназію з дзьвюма беларускімі клясамі, на якія, здаецца, і дэкляравала субсыдыю.

Школьным Кўратарам Лідзкага Округу выдана Кіраўніцтву гімназіі адпаведная папера.

Здаецца, усё зроблена — толькі пачынаць прыймовая экзамены і адкрываць заняткі. Але гэта ня польскім школам, а злашча дзе ёсьць хоць цень беларускасьці, ня так лёгка зрабіць.

Справа ў тым, што маемасьць вышэй адзначанай гімназіі — парты, шафы і іншая, забрана для польскіх школаў, і памяшчэньне, ня гледзячы на забарону рэквізыцыяў прыватных памяшчэньняў, ня гледзячы, што памяшчэньне заарэндавана гімназіяй і наўперад заплочаны грошы і зроблены на значную цыфру рамонт, памяшчэньне гэтае зрэквізавана Несвіскім Старостввам пад пагранічную Камісію, а для гімназіі застаўлены толькі два пакоі.

Другая справа ў тым, што выдаўшы дазвол на адкрыцьце беларускіх клясаў тым-жа самым кўратарам забаронена прыймаць вучаніц у гэтыя клясы, покуль ня будуць прадстаўлены праграмы з прадметаў, якія будуць выкладацца ў гэтых клясах.

Далей, калі сталі рабіць прыём вучаніц у расейскія клясы у двух астаўленых пакоях, то прышлі прадстаўнікі ўлады, загадалі спыніць экзамены і асвабадзіць апошнія два пакоі, якія фактычна і пасьля гэтага не займаліся ў працягу некалькіх дзён. Ня гледзячы ні на якія просьбы і довады, памяшчэньне усёж-такі рэквізавана. Гімназія з рэштаю мэблі у літэральным сэнсе выкінута на двор.

Цікаўна што ўсё гэта рабілася тады, калі пачаліся аднача сна экзамены ў польскую і пераходна-польска-расейскую гімназіі.

Замест зрэквізаванага памяшчэньня Староства прапануе будынак былога вастрогу, што стаіць зусім на краю города, куды, невядома, ці пайшлі бы дзеці. Але-ж трэба уцерці слёзы. І чым гімназія будзе гарантыравана ад таго, што туды могуць прывясьці арыштантаў і ўзноў заняць, як былы вастрожны дом.

Лічучы сябе несправядліва пакрыўджаным, кіраўніцтва зьвяртаецца у вышэйшыя інстанцыі: у міністэрства унутраных спраў і асьветы, з просьбаю, каб будынак гімназіі аддалі назад.

Можа там справядлівей разьбяруцца у гэтай справе і не дапусьцяць, каб у мірны час (бо ўжо рыжскі трактат навет ратыфікованы) былі выкінуты на вуліцу грамадзянскія навуковыя установы, у якіх атрымліваюць адукацыю і узгадаваньне сотні дзяцей грамадзян.

Ш.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Стары чарнасоценец.

У вёсцы Гарадзешня, Забрэскае воласьці Валожынскага павету ёсьць каапэратыў „Надзея". Каапэратыў, ведама, беларускі, як і ўсе тут людзі беларусы, дый сьвядомыя беларусы, якія паважаюць і любяць сваё роднае. Шкада толькі, што пісарам (сэкрэтаром) у праўленьні каапэратыву і разам бугальтэрам ёсьць стары чарнасоценец Амільян Сівец з Гародзькаў. А. Сіўцу не памаглі ніякія рэвалюцыі, ён якім быў чарнасоценцам, такім і астаўся дагэтуль, і як ненавідзіў беларускі народ, так ненавідзіць яго і цяпер. Ен каб прымеў, дык-бы зьніштожыў беларускі рух. Дайшло да таго, што ён ня гледзячы на дамаганьне гаспадароў, вывесіў у каапэратыве вывеску не пабеларуску, а памаскоўску і папольску і, ня гледзячы на пратэсты, яе не зьмяняе. Відаць, гэты панок перад сваім канцом так злуецца на беларускі рух, бо такіх людзей, як ён, што моляцца на „бацюшку царя і матушку Маскву", робіцца ўсё меней і меней. Вы, пане Сівец, у сваёй не навісьці да беларускае вывескі падобны да таго паліцыянта з Забрэзьзя, што надоячы нашаму гаспадару, Янку Марзаку, загадаў зьняць дошчачку, на якой было напісана пабеларуску „Янка Марзак".

Гаспадар.

Каланізацыя.

У Вялейскім павеце, Вязынскай воласьці ўсе фальваркі пана Гіцэвіча, апроч двара Вязынь, бяруць пад каланізацыю; з іх 70 проц. пойдзе пад жаўнераў і толькі 30 проц. - нашым сялянам.

Лес-жа таго самага пана Гіцэвіча ў трывугольніку Вялейка-Вязынь-Маладзечна, як чуваць, адкупілі варшаскія купцы, каторыя ўжо аглядаюць яго і рыхтуюцца высякаць у пень гэты лепшы лес нашага павету.

Што з гэтай гаспадаркі будзе?
Ці ведае аб усім гэтым палежная ўлада?

Дзед Кузьма.

Просьба да пана начальніка рэвіру.

Гаспадары Забрэскае воласьці Валожынскага п. зварочываюцца праз „Беларускія Ведамасьці" з просьбай да свайго рэвіровага начальніка, каб ён забараніў паліцыянтам зьдзіраць самадумам дошчачкі ля хат з надпісам пабеларуску. Гэткую дошчачку нядаўна паліцыянт з Забрэзьзя загадаў зьняць гаспадару з Гарадзешні, Янку Марзаку. Мы спадзяемся, п. начальніку, што па вашаму загаду гэны паліцыянт прыдзе і абвесьціць Янку Марзаку, што гэтакія беларускія напісі ўсе могуць рабіць.

З пашанаю Гаспадары Забрэскае воласьці.

Да чаго дайшоў Валожынскі інспэктар.

Валожынскі школьны інспэктар навет адмовіўся прыняць заявы насяленьня з просьбаю адчыніць беларускія пачаткавыя школы. Дык усе гэныя няпрынятыя інспэктарам заявы перададзены старшыні «Rady Ludowej» (Рады Людовай) Валожынскага пав. грамадз. Башаркевічу.

Бацька.

Вёска Кяна, Віленскага пав.

Беларуская сьвядомасьць пашыраецца. Нашую Кяну можна залічыць у лік адраджаючыхся тут беларускіх сьвядомых вёсак, як вёскі: Репаўцы, Дзеданішкі, Нявярышкі, Лаварышкі, Адамчукі і г. д.

Апошнімі часамі сталі прыходзіць беларускія газэты, праз каторыя мы сталі праглядаць на сапраўдны сьвет Божы, каторыя нам змылі з сонных павек увесь бруд, якім нас аблеплівала і дагэтуль ня кідае сваей работы цёмная хмара розных крукоў-агітатараў, стражнікаў крэсовых, каторыя за свае абяцанкі-цацанкі, за зямлю, соль і жалеза хочуць нас уцягнуць на рожных „вецах", каб мы галасавалі, як яны хочуць. Але ўжо недажданьне, трохі пазнаём самыя сябе...

Ураджай сёлета сярэдні, бо летняя засуха трохі пашкодзіла. Але каб Бог сцярог ад нашых дабрадзеяў, то людзцы самі сябе выкармілі-б Дворныя землі блізу ўсе ляжаць дзірваном, а людзям не даюць, бо хочуць, каб абавязкова купілялі ў іх зямлю ды плацілі такія шалёныя цэны, што нам, здаецца, ня толькі за гэтакія грошы купіўбы тую зямлю, але і разам з ей тога самага пана-скуралупа. Так адзін пан (прозьвішча ня помню), каторы дзяржаў фольварак Смольнікі, (6 вёрст ад Шумска), за 6 валок дзірвана хоча паўтара міліёна марак. Добрыя людзцы, парайце, скуль браць тыя мільёны, каб купіць зямельку для сябе ды мець на чым даставаць кусок будняга хлеба.

Кутнік.

М-ка Ільля, Вялейскага павету.

2-га жніўня ад невядомай прычыны быў у нас пажар. Ад 5 гадзіны дня да 10-й вечара згарэла болей як 60 хат. Згарэлі глаўным чынам гандляры - жыды. Цяпер ад раніцы да вечара стукаюць тапары — будуюць новыя хаты. Толькі дзівам ацалеў ад пажару тутэйшы каапэратыў „Ластаўка," які існуе з 1917 году. У гэтым годзе каапэратыў прадаў тавару болі, чым на 2 міліёны марак. Працаваць у гэтым годзе ён пачаў з 8.000 марак. Усе працаўнікі ў ім беларусы. Многа церпяць яны нападкаў, але працуюць на карысьць грамадзян.

Беларус.

ЭКАНАМІЧНЫ АДДЗЕЛ.

Жыцьцё парабкаў.

Як ні марна ў нас жыцьцё агулам працоўнага люду, але парабкі па панскіх маёнтках знаходзяцца ў самым горшым становішчы.

Колі параўняць заработную плату парабка ў маёнтку з платаю якога-небудзь дворніка ў Вільні, ці возчыка, што саматужкаю перавозіць рэчы сьпекулянтаў, то стане ясна, чыё лепшае жыцьцё.

Возчык найменей зарабляе за дзень 500 мар., а парабак у маёнтку самае найбольшае дастае ад пана на месяц 200 мар. і 2 пуды збожжа. Значыцца, парабку дастаецца за працоўны 16-ці гадзінны дзень не балей як 150 мар. Тымчасам праца ў полі канчаецца, і некаторых паны выкідаюць на вуліцу, адказываюць ім службу.

Выходзіць так, што парабак працаваў цэлае лета, як чорны вол, і пражываў усе свае заробкі з сямействам, а на зіму ідзі сабе куды хочаш, бо больш ты не патрэбен. Каму паскардзішся? У каго папросіш ратунку? Існуе „Związek Robotników Rolnych", але ён на столькі слабы, што ня можа нічога парадзіць, бо каб сутрымоўваць людзей здольных да гэтай працы, трэба мець грошы, а Związak пакуль што іх ня мае. Такім чынам парабкі застаюцца на волі лёсу.

Я. Відук.

Высілкі.

Людзі палітыкі думаюць выпаўніць неразрашымую задачу: уцягнуўшы ў палітыку эканамічныя ўстановы, вясьці добра гаспадарку старонкі. І выходзіць тое, што ўсе высілкі палітыкаў разьбіваюцца аб жыцьцё, якое ня хоча зьмяняцца па указцы. І чым мацней барацьба з няўгоднымі эканамічнымі ўстановамі, чым болі падатлівыя эканамічныя ўстановы ўцягіваюцца ў палітыку, тым болі і болі горшаець становішча краю.

Так здарылася з аправізацыяй. Два месяцы таму назад вырашылі зьліквідаваць Дэпартамэнт Аправізацыі, а тым часам гэты Дэпартамэнт спыніў ужо куплю прадуктаў, якую дагэтуль рабіў за свае грошы. Каапэрацыйныя ўстановы разьдзелены на „сваіх" і „чужых". „Свае" павінны рабіць тое, што будзе падабацца палітыкам, а да „чужых" адносіны такія, што іх пакуль што церпяць, але ўсюды даюць зразумець, што яны ёсьць ворагі, з якімі варта вясьці барацьбу, а ня супольна працаваць. А тым часам дарагоўля харчовых рэчаў усё мацней дае сябе адчуваць.

Пастанаўляюць Дэпартамэнт Аправізацыі перадаць Дэпартамэнту Промысла і Гандля. Думаюць Аправізацыйны Аддзел гэтага Дэпартамэнта заставіць аправізаваць Вільню. Кінуць 600 мільлёнаў на куплю прадуктаў, а посьле, трэба спадзявацца, будзе шмат аружжа зломана, каб іх разьдзяліць.

А дарагоўля павялічываецца... Час на куплю, напрыклад, бульбы мінаецца. Неўзабаве яе схаваюць у ямы, пачнуцца марозы. Ды й на іншую агародніну час пройдзе. Збожжа даражэець ужо кожны час, а ня дзень. Вывозіцца яно з Віленшчыны (ня толькі Літвы Сьродковай) у дужа значным ліку, і ўрэшце можаць здарыцца тое самае, што з праворым сынком, які „покуль абуўся, дык яго дзед і змалаціў"...

Выйсьце-ж адно: трэба ўсе арганізацыі, якія толькі могуць заняцца дастаўкай у Вільню збожжа, прыцягнуць да гэтае работы як найхутчэй і не падхадзіць з палітычным аршынам да некаторых з іх.

С. Чыжэўскі.

абіраюць з паміж сябе на год аднаго Старшыню, двух яго Заступнікаў, двух пісараў, Скарбніка і яго Заступніка.

§ 19. Што год выступае чатырох Сяброў Рады, першыя два гады, кідаючы на жэрабя, а далей паводле старшынства выбараў. Выступаючыя Сябры Цэнтральнае Рады могуць быць ізноў выбраны.

§ 20. Да компэтэнцыі Цэнтральнае Рады належыць:

а) загадаваньне маемасьцяю Таварыства;

б) купляньне і прадаваньне лежачае маемасьці, працэнтных папер і розных рухомых маемасьцяй.

в) прыймо дароў і запасаў умоўных і бязумоўных.

г) рабіць розныя ўмовы і даваць усялякага роду паўнамоччы, а паміж іншым і вясьці судовыя справы;

д) рабіць годнія справаздачы і буджэты;

е) кіраваць усялякімі справамі Таварыства на аснове гэтага ўставу ў межах компэтэнцыі, дадзенае Агульнаю Вялікаю Зборкаю;

ж) прыгатаваньне інструкцыяў і рэгулямінаў для Цэнтральнае Рады.

§ 21. Рада можа тварыць асобныя аддзелы для паасобных спраў паводле інструкцыі, зацьверджанае Наглядаю Радаю.

§ 22. Паседжаньні Цэнтральнае Рады бываюць у меру патрэбы, а прынамся двойчы ў месяц.

Дзеля важнасьці пастаноў патрэбна быцьцё Старшыні або яго Застукніка і прынамся 6 Сяброў Рады.

Пастановы прымаюцца простай большасьцяй галасоў, пры роўнасьці галасоў пераважуе голас Старшыні.

§ 23. Старшыня або яго Заступнік прадстаўляе Таварыства на вонкі і разам з адным пісарам падпісуе ад імя Таварыства ўсе паперы і дакумэнты.

Чэкі, загады выплатаў падпісуе Старшыня і Скарбнік Цэнтральнае Рады.

6. Наглядная Рада.

§ 24. Наглядная Рада складаецца з дзесяцёх Сяброў, якіх абірае Агульная Вялікая Зборка.

Сябры Рады абіраюцца на тры гады. Пераз два гады выступае па трох, а ў трэцім годзе 4 Сяброў; першыя два гады кідаючы на жэрабя, а далей паводле старшынства.

Выступаючыя Сябры Нагляднае Рады могуць быць узноў выбраны.

§ 25. Наглядная Рада:

а) рупіцца аб правядзеньні ў жыцьцё заданьняў Таварыства Беларускае школы згодна § 1 і 2 гэтага ўставу і кантралюе згоднасьць дзейльнасьці Цэнтральнае Рады ды ўсіх іншых органаў Таварыства з правіламі статуту, рэгулямінаў і інстукцыяў

б) правярае касу Цэнтральнае Рады прынамся раз у год;

в) мае права пераглядаць кніжкі і пратаколы паседжаньняў Цэнтральнае Рады і іншых органаў Таварыства;

г) мае права дамагацца, каб Цэнтральная Рада згукала Агульную Вялікую Зборку і пастанавіла на дзеняшнім парадку справы і праекты пададзеныя Радаю.

д) Мае права задзержаць кожную пастанову ўладаў Таварыства, супярэчную з прынцыповымі правіламі гэтага ўставу або заданьнямі Таварыства, дамагаючыся адначасна згукаць Агульную Вялікую Зборку дзеля астатняй пастановы ў спорнай справе,

е) зацьвярджае рэгуляміны і інструкцыі, аб якіх гутарка ў § 16 і 21 гэтага стутуту;

ж) прадстаўляе Агульнай Вялікай Зборцы годнюю справаздачу з сваедзейнасьці і свае праекты.

з) апрача гэтага Сябры Нагляднае Рады могуць з дарадчым голасам прымаць учасьце ў зборках Цэнтральнае Рады і ўсіх органаў Таварыства;

§ 26. Наглядная Рада можа назначыць з паміж сябе для рэвізыяў, аб якіх гутарка ў § 25.

§ 27. Наглядная Рада выбірае з паміж сваіх Сяброў на адзін год Старшыню, 2-х віцэ - Старшыняў і 2-х пісароў.

§ 28. Паседжаньні Нагляднае Рады бываюць у меру патрэбы, а прынамся 4 разы ў год.

Дзеля важнасьці пастаноў Нагляднае Рады патрэбна быцьцё прынамся шасьцёх Сяброў Рады, ў тым ліку Старшыні або аднаго з віцэ-Старшыняў.

Пастановы прымаюцца простай вялікшасьцяй галасоў.

Пры роўнасьці ліку галасоў пераважае голас Старшыні.

7. Агульная Вялікая Зборка.

§ 29. Агульныя Вялікія Зборкі бываюць звычайныя і надзвычайныя. Звычайныя Зборкі згукавае Цэнтральная Школьная Рада ў Вільні.

§ 30. Надзвычайныя Зборкі згукавае Цэнтральная Школьная Рада па сваёй ініцыятыве, або па дамаганьню Нагляднае Рады, або, на апошку, на дамаганьня прынамся ¼ агульнага ліку Акружных Школьных Радаў.

Цэнтральная Школьная Рада мае абавязак згукаць Агульную Вялікую Зборку не пазьней як за тры тыдні, дастаўшы пісьменнае дамаганьне.

§ 31. Аб дні і месцы Агульнае Вялікае Зборкі Цэнтральная Школьная Рада апавяшчае ў беларускіх газэтах, наказуе пісьменна прынамся за два тыдні перад днём Зборкі.

§ 32. Агульная Вялікая Зборка складаецца:

а) з Сяброў Нагляднае Рады,

б) з Сяброў Цэнтральнае Школьнае Рады і іх заступнікаў.

в) з прэзыдыумаў заўсёдных Цэнтральнае Школьнае Рады, ня болей як па тры чалавекі з кожнага аддзелу;

г) з дэлегатаў Акружных Школьных Рад па двух ад кожнае Рады;

д) з дэлегатаў Гурткоў па двух ад кожнага Вокругу;

е) з пачэсных Сяброў.

Асобы, што маюць права прымаць учасьце ў Агульных Вялікіх Зборках, ня могуць перадаваць гэтага права іншым.

§ 33. Агульная Вялікая Зборка ё найвышэйшаю ўстановаю Таварыства, якая выбірае Сяброў Нагляднае Рады, Цэнтральнае Школьнае Рады і разьвязуе астатачна ўсялякія справы Таварыства.

§ 34. Агульная Вялікая Зборка мае права пастанаўляць, калі зьбярэцца прынамся ¼ людзей, маючых права прымаць учасьце ў гэтай зборцы.

Аднак, для пастаноў аб зьмене статуту, ліквідацыі Таварыства і для пастаноў аб маемасьці Таварыства пры яго ліквідацыі, вымагаецца быцьцё палавіны Сяброў, якія маюць права ўчасьця ў Агульнай Вялікай Зборцы. У абвестках аб гэтай Зборцы падаецца парадак дня.

Пры няпрыбыцьці на Агульную Вялікую Зборку, вымаганае дзеля яго правамочнасьці колькасьці Сяброў—будзе Зборка друганаваротная на два тыдні пазьней і пастановы гэпае Зборкі будуць абавязаваць бяз увагі на лік быўшых на Зборцы. У абвестцы аб тачоў зборцы гэта павінна быць выразьліва адцемлена.

На друганаваротнай Зборцы можна разглядаць толькі справы, што былі на парадку дня першае зборкі, што не адбылася.

§ 35. Пастановы Агульнае Вялікае Зборкі прымаюцца простай вялікшасьцяй галасоў. У справах-жа аб зьмене статуту, ліквідацыі Таварыства і пастаноў аб маемасьці Таварыства пры яго ліквідацыі—вялікшасьцяй ⅔ галасоў.

8. Ліквідацыя Таварыства.

§ 36. Калі-б Таварыства дзеля якіх-небудзь прычын было зьліквідавана або само зьліквідавалася, уся яго рухомая і ляжачая маемасьць пераходзіць на пашырэньне і паддзержку асьветы ў беларускім нацыянальным дусе, згодна з пастановаю Агульнае Вялікае Зборкі, або абранае гэтай Зборкаю Ліквідацыйнае Камісіі, — аднак захоўваючы паасобныя ўмовы дараў і запісаў.

Аляксандар Дмахоўскі.

Міхал Кахановіч.

Францішак Аляхнович.

Антон Луцкевіч.

Браніслаў Тарашкевіч.

Niniejszy statut zawierajacy 36 §§ ów został zatwierdzony w Departamencie Spraw Wewnętrznych dn. 1. VII. 1921 r. Wciągnięty do rejestru I pod № 16.

Naczelnik Wydziału administracyjnego wz. Czarnocki.

Сябры і грамадзяне! Складайце грошы на газэту, якая бароніць нашу народную справу. Зьбірайцеся гурткамі і выпісывайце яе на вёску хоць адзін экзэмпляр. Калі будзець больш надпісчыкаў, газэта станець на цьвёрдыя ногі. Не адкладайце надпісываньня, бо ад гэтага залежаць далейшае жыцьцё „Беларускіх Ведамасьцей". Хто ня умее чытаць, хай просіць, каб яму прачытаў пісьменны сусед, або настаўнік, або сьвяшчэньнік, або старэйшы вучань беларускай школы. Зьбірайцеся грудам і чытайце грудам. Вучыцеся бараніць нашы народныя справы. Памажыце газэце, якая з вамі і за вас адбіваецца ад нашых нацыянальных і соцыяльных ворагаў і працуець над развіцьцём роднае культуры. Лічыце сваім абавязкам скласьці хоць адну марку на агульную народную справу. Годзе нам спаць, годзе нам быць самым адсталым народам. Браты, прымiце блізка да сэрца усе гэтыя словы! Настаўнікі, пільнуйце, каб „Беларускія Ведамасьці" у вашым раёне выпісываліся і пашыраліся. Хай жывець народная справа!

Сьпіс прадуктаў на рынках у Вільні

НАЗОУ		20.IX	23.IX
жыта	пуд.	1850	2100
ячмень	"	1650	1800
авёс	"	1500	1500
гарох	"	1750	1800
бульба	"	500	575
саланіна	фунт.	520	500
мяса ялавічына	"	125	120
" сьвініна	"	240	260
" баранінае	"	—	160
масла кароўскае	"	600	650
яйкі	шт.	22	21
малако	кв.	80	60
сьмятана	"	400	375
сыр	фунт.	120	125
хлеб чорны	"	45	50
" белы	"	70	75
сала топл.	"	560	450
капуста	пуд	500	700
буракі	"	420	450
морква	"	400	450
мука жытняя	"	1900	2150
" пшонная	"	5200	5200
цыбуля	"	1400	1400
фасоля	"	400	450
рыс	"	500	—
крупы ячм.	фунт.	60	—
" пярлов.	"	50	—

☞ У раёне Баранавіч, Валожынскага павету, 20. IX. былі вось якія цэны: жыта 1500 - 1600 м., бульба 300 м., мёд пчаліны 250 - 280 м., семя ільняное 1600 - 1800, цыбуля 1000 м., яблыкі зімовыя фунт 0., масла кароўскае хунт 300 - 320м., яйкі 12 13 м. штука, малако кварта 30 мар., сыр 70 75 мар.

☞ На купляваньне сеня і іншых прадуктаў аддзел Баранавіцкага аддзелу „Спольма" Віленскі Саюз атрымаў каля мільёна марак пазыкі. Купля будзе рабіцца у Вагдан ўсім раёне Валожынскага павету.

☞ Віленскі Саюз Каапэратываў на канец кастрычніка (акціабра) склікае Раду Саюзу для разгляду розных пытаньняў.

☞ Інструктар Віленскага Саюзу Каапэратываў, каторы у Опсе Браслаўскага павету, на запытаньні на агульным сходзе каапэратыва аднасяльцаў папольску і пабеларуску, было заяўлена гаварыць пабеларуску. Усё Опса насялена выключна гаворачымі пабеларуску.

☞ У Браслаўскім павеце гутараць аб тым, што як быццам Староства атрымала прыказ з Варшавы сабраць з павета як натуральны падатак 400 вагонаў збожжа. Будзем спадзявацца, што гэтыя гутаркі не спраўдзяцца.

У Браслаўскім павеце добра ў гэтым годзе ўрадзіліся яблыкі і грушы. Наехала многа пакупцоў. Цэны, якія дагэтуль былі да 300 мар. за пуд яблык, павялічыліся да 600 мар.

☞ Ня гледзячы на тое, што на Вялейскі павет назначана шмат нафты, яна не прыбывае, і ў павеце голад на яе. У прыватным гандлю фунт каштуе ад 40 да 50 марак.

☞ У Навагрудзкім павеце ў гэтым годзе дужа добрае сьлецце на агародніну: цыбулю, якая каштуе каля 600 мар. пуд, морквy, буракі, грыжу і г. д.

☞ Дужа значны лік зялеза: зялезнага лому і зялезных бэлек вывозіцца з Віленшчыны у Польшчу. Усё багацьце, якое засталося ад сусьветнай вайны у нямецка-расейскіх акопах, распрадаецца на частках Польскай арганізацыяй „Дэмобіль" і вывозіцца сотнямі вагонаў.

З Літвы Сьродковай ад 1 студня г. г. да 1 верасня вывезена 5969 ваг. лесу, з іх у вадным толькі жніўню—1311 вагонаў. Лес главным чынам вывозіцца заграніцу. З 1311 вагонаў у жніўню вывезена заграніцу 1219 ваг. і 92 ваг. у Польшчу. Калі вывоз будзе расьці так і далей, то ў хуткім часе лясное багацьце нашага краю будзе распрададзена.

☞ Як паведамляе часопісь „Kooperacja", склады Аддзелу Віленскага Саюзу з Дукшт перавозіцца у Опсу. Опскае таварыства дарма аддае палову свайго уласнага памешканьня саюзу пад склады да вясны.

☞ У Дзісненскім павеце голад на соль. „Гуртоўня Крэсовая", якая дастаўляе „урадовую" соль, шмат па ёй зарабляе і пры раздачы ставіць высокую цану. (Kooperacja).

☞ Каля граніцы з Расеяй, у Дзісенскім павеце, у якім староства дагэтуль не дазваляла працаваць Віленскаму саюзу каапэратываў і гдзе не працаваў раённы інструктар, стварыліся каапэратывы, якія займаюцца главным чынам шмуглем тавараў у Расею, а іншыя—гандлем гарэлкай. (Kooperacja).

☞ Істнуючый у Вільні саюз пад назвай: „Цэнтраля Рольніча - Гандлёвая" (Юраўскі праспект 25), арганізацыя „Стражы Крэсовай", падтрымліваецца рознымі Дэпартамэнтамі у пастаці вялікіх пазычак; напрыклад: Дэпартамэнт Апрявізацыі даў адзін міліён. Дэпартамэнт Промыслу і Гандлю адзін міліён і Дэпартамэнт лясоў шэсьць міліёнаў мар. Саюз гэты лічыць сябе установай каапэрацыйнай, а між іншым на апошнім сваім зьезьдзе паўнамоцнікаў вырашыў уступіць сябрам у гэткія акцыйныя установы: 1) У Акцыйнае т-ва „Коопэрацыя Рольная у Варшаве" з паем да 500.000; 2) да спулкі „Папер" у Вільні з паем 50.000 мар. і 3) да Віленскага Банку Рольніча-Прамысловага з паем 500.000.

Цікава, ці каапэрацыйная установа будзе падлягаць кантролю акцыйнага таварыства?

ХРОНІКА.

✦ Акадэмік Е. Карскі прыслаў аднаму віленскаму беларусу пісьмо з Пецярбургу (Вас. Остр., 7 линія д. 2 кв. 10), у якім паведамляе, што выйшла з друку яго новая кніга: „Беларусы. III, 2—Старая беларуская пісьменнасьць", Петраград, 1921. Акадэмік цікавіцца літэратурнымі навінамі і просіць перадаць паклон усім землякам. Пісьмо выслана 1 верасьня г. г.

✦ У Віленскі Белар. Нац. Камітэт прыйшла такая адкрытка:

Шаноўныя паны! Зьвяртаюся да вас з вялікай просьбай. Калі ласка, прышліце беларускіх кніжак і газэт, календар. Прыслаў-бы вам грошы, ды ня ведаю, як іх пераслаць вам. Дайце раду,—прышлю. Маю бібліаграфічны матар'ял аб памёршым беларускім паэце Алесе Гаруне (Аляксандру Валадзіміравічу Прушынскім), штук каля 20 пісулек і адзін верш, каторы яшчэ нідзе недрукаваны. Пісаў ён яго для мяне. Жылі мы з ім недалёка, ён у Кірэнску, а я ў Усьцькуце, вёрст каля 200. Летам кожны год прыяжджаў ка мне. Пішыце адповедзь. З пашанай к вам беларус Захар Борка. Адрэс мой: гор. Кірэнск Іркуцкай губ., З. Борку.

Пісьмо выслана 28-га ліпня г. г.

✦ З Гор-Горак Магілеўскай губ. прышло пісьмо, што заняткі ў Сельска-Гаспадарчым Інстытуце ужо пачаліся. Навучаньне пастаўлена добра. Прыймалі студэнтаў і студэнтак па экзаменах з праграмы мірнага часу. Слаба падгатаваныя не паступілі.

✦ Першая партыя студэнтаў беларусаў ужо выехала з Вільні ў Прагу, у чэскія вышэйшыя школы.

✦ Прадстаўнікі Віленскага Белар. Нац. Кам. не маглі выехаць на зьезд у Празе дзеля нявыдачы ім перапускаў у патрэбны час.

✦ Беларускі Музыкальна-Драматычны Гурток разьвівае сваю дзейнасьць. Апроч заўсёднай групы артыстаў і хору цяпер будзе выступаць яшчэ і струнны аркестар; для гэтага закуплены ўжо поўны комплект інструмэнтаў. Кіраўніцтва даручана добраму мастаку. Аркестар гэты будзе адзіны ў Вільні па сваім тыпе і трэба спадзявацца, што публіка зацікавіцца ім.

✦ Грам. Ф. Аляхновіч з'арганізаваў з мясцовых мастацкіх сіл драматычную трупу, з якой на будучым тыдні зьбіраецца ў аб'езд правінцыі. Прыгатоўлены гэткія п'есы: „Птушка шчасьця"—Аляхновіча, „Зьбянтэжаны Саўка"— Родзевіча, „Я памёр" (пераклад) і „На адным крэсьле" (пер.).

✦ У мінулую нядзелю артыстамі Бел. Муз.-Драм. Гуртка на Біскупскай 12, была пастаўлена п'еса З. Белай «Пацалунак Юды».

✦ Нехта Ver. у мясцовай „Gazecie Wileńskiej" прабуе падлічыць, колькі каштуе дзень пражыцьця ў Вільні. Бяручы за прыклад сям'ю з 4 асобаў (якіх ёсьць найбольш) грам. Ver аблічвае гэтак: сьнеданьне—хлеб 160 мк., цукер 30 мк., гарбата й апал 30 мк., агулам 220 мк., калі піць толькі гарбату і есьці сухі хлеб. Найтаньнейшы палудзень у рэстаране каштуе 800 мк., а з хлебам дык 900 мк. Вячэра з вандліны, хлеба і ізноў гарбаты каштуе на 4 асобы найменей 300 мк. А разам, проста галоднае харчаваньне абходзіцца ў дзень 1500 мк. А дзе кватэра, сьвет, апал, дзе адзежа й іншыя рэчы? Ці-ж можна, паводлуг гэтага пражыць, маючы ў месяц 40, або 50.000 марак?—пытаецца аўтор.

✦ Паэт Цішка Гартны (З Жылуновіч) прыехаў у Коўню і знаходзіцца ў тутэйшай місыі Маскоўскае Савецкае Рэспублікі. Мэта яго падарожы: заказ за граніцамі Савецкае Беларусі некалькіх падручнікаў і розных кніжак на беларускай мове.

✦ З 1 кастрычніка пачаліся заняткі ў Літоўскай праваслаўнай сэмінарыі ў Вільні. У новую праграму ўведзена выкладаньне беларускай мовы і літэратуры, гісторыі і географіі Беларусі. Цікаўна, калі будуць уведзены гэтыя навукі ў праграму каталіцкай сэмінарыі ў Вільні, рыхтуючай ксяндзоў для беларускага каталіцкага насяленьня? Радзім „Krynicy" заняцца гэтым пытаньнем, як і пазабытым чамусь пытаньнем аб касьцёле для віленскіх беларусаў-каталікоў.

☞ Беларусы! Каму дарагі справы роднае культуры, усе, як адзін, запісывайцеся ў Таварыства Беларускае Школы. Запісывацца можна ў Віленскай Беларускай Кнігарні (Завальная, 7), а з правінцыі—прыслаўшы пісьменую заяву ў Таварыства (Вільня, Вострабрамская, 9). Выпісывайце Статут Таварыства. Чым болей будзе сяброў у Таварыстве, тым лягчэй будзе разьвіваць беларускую асьвету. Запісацца можаць, і павінен кожны: інтэлігент, селянін, работнік.

Агляд кніг.

Jadwihin Sz. Uspaminy. Wydańnie Krajowaj Suwiazi. Wilnia. 1921.

Кніжка напісана ўмелай рукою старага пісьменьніка і зьмяшчае ў сабе надта цікаўныя малюнкі студэнцкага жыцьця ў Маскве ў часе страшэнных перасьледаваньняў студэнцкай моладзі (90-я гады). Для нас яна цікаўна яшчэ тым, што ёсьць, так сказаць, гісторыяй пачатковага развіцьця нашага руху, гісторыяй нарадзін таго студэнцкага беларускага гуртка, які меў, як і пецярбурскі гурток, выдатнае значаньне ў нашым адраджэнцкім руху. Астаецца толькі пажадаць, каб беларускія выдаўцы парупіліся выдаць кніжачку „Успамінаў" Ядвігіна Ш. таксама і гражданкаю, для няўмеючых чытаць лацінскімі літэрамі.

Ш.

Анна Окушко. Первые цветы. Сборник стихотворений. Вып. I. Вильна, Іюнь 1921 г. Кн—во В. Знамеровского.

Невялікая сымпатычная кніжачка. Мяркуючы з партрэта — пясьнярка яшчэ вельмі маладая. Вершам яна валадаець зусім добра. Асабістых перажываньняў у пясьняркі яшчэ дужа мала, і гэта адбіваецца на тэмах усіх яе лірычных рэчаў. Перайманьне відаць надта выразна. Асабліва моцна чуецца (і гэта зразумела!) уплыў Надсона. Такія вершы, як „Отчего," „Неужели и в вас этот горький обман," „Сказка" і інш. зусім зьбіваюцца на вершы Надсона. Меркаваць аб разьмерах таленту аўторкі па гэтым зборніку трудна. Няможна абмежывацца месяцам, салавейкам, нявыразнымі лятуценьнямі і смуткам. І гэта у наш час! Можа быць, па ўзросту, нельзя яшчэ іншага й чакаць ад аўторкі,—дык тады зьяўляецца пытаньне: ці ня рана выступаць са зборнікам у друку?

Д. Б.

Kazimierz Pujda. Mirga. Dramat historyczny w 4 aktach (z litewskiego). Wilno 1921. Wyd. „Nowin Wileńskich."

Дужа слаўная рэч. Дапраўды назваць твор К. Пуйды драмаю нельга, гэта—схема драмы, нарыс, эскіз. Доказам таму ёсьць і разьмер твору — уся чатырохактовая гістарычная драма займае 34 странічкі in 16.º Але які гэта сакавіты, прыгожы, жыцьцёвы нарыс! Як дасканальна абчырчана гераіня Мірга, вызваляючая Вітаўта з жонкаю з цямніцы і нежадаючая ўцякаць, бо сьмерць яе—патрэбна, як ахвяра багам, дзеля дабра князеўскай пары! А ў руках Вітаўта — шчасьце бацькаўшчыны!.. І Мірга гінець на шыбеніцы. Аўтор троху разыйшоўся з гістарычнай праўдаю, бо ні Гімбут і ня Більген былі пастаўлены Ягелам на чале Крэўскага замка, а Лісіца — галоўны забіўца Кейстута. Аўтор-жа зрабіў Лісіцу канюхом. Але гэта ёсьць драбніца. Пакажам на нехараство 4 акта з таго боку, што павешаньне Міргі адбываецца на вочах у глядзеньнікаў. Мабыць, тут павінна ўмешвацца рэжысура пры пастаноўцы гэтай п'есы на сцэне.

Д. Б.

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

✦ У Грэцыі ў зьвязку з астатнімі няўдачамі на малаазіяцкім фронце рэвалюцыйны рух пашыраецца ўсё болей. Афіны на асадным стане. (Е. Е)

✦ Угорцы (венгры) абвесьцілі незалежнасьць правінцый, якія Угоршчына павінна была адступіць Аўстрыі. (Pat).

✦ У Бесарабіі пачалося камуністычнае паўстаньне. Паўстанцы перарвалі зялезную дарогу між Ларгаю і Новаселіцкаю. У Хоцімскім павеце страшным спосабам забіт пан Мешан з усёй сям'ёю. Было яшчэ колькі нападаў на панскія двары. Уся Бесарабія на ваенным стане. Румынскія салдаты б'юцца з паўстанцамі. Шмат растрэленых сялян. (Polpr.)

✦ Ува ўсіх мусульманскіх гаспадарствах адбываюцца патрыятычныя маніфэстацыі з прычыны турэцкіх пабед над грэкамі. (Polpr.)

✦ У Лёндане была вялізная дэманстрацыя безработных з рэвалюцыйнымі штандарамі. (Е. Е.)

✦ Ангельскі ўрад паведаміў Дэ Валеру, што зракаецца сваіх ранейшых варункаў і хоча мець ізноў перагаворы з сінфейнерамі. (Pat.)

✦ На зьезд у Прагу выехала з Коўні шмат беларусаў, у тым ліку старшыня беларускага ўраду Ластоўскі, старшыня Рады Бел. Народ. Рэсп. Крычэўскі і інш.

Паштовая скрынка.

М. Ч. Рэваль.

Л-чу можна пісаць на Вілен. Бел. Нац. Каміт. (Вільня, Вострабрамская, 9).

Ц. Г.

Есьць добры пераклад „Ткачоў" Г. Гауптмана і розныя іншыя рукапісы.

Курс на грошы ў Вільні.

30 верасьня 1921 г.

Нямецкія маркі (1000)	55
Ост маркі (1000)	52,50
Доляры	6800
Золата рублі (100)	274.000

Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт
Вільня, Вострабрамская 9.

АБВЕСТКА

З дазваленьня Міністэрства Веравызнаньня і Прасьветы Грамадзянская Прыватная Жаноцкая Гімназія у Несьвіжы аднаўляе сваю дзеяльнасьць у 1921-22 вучэбным годзе.

Прадметы у клясах 3, 4, 5, 6, 7, і 8 будуць выкладацца у расейскай мове, у клясах 1 і 2 у беларускай мове. Прыймовыя экзамены ва ўсе клясы і пераэкзаменоўкі пачнуцца з 26 верасьня.

Па зканчэньніі экзаменаў пачнуцца клясныя заняткі.

Утрымацель Прыватнае Жаноцкае Гімназіі ў Несьвіжы У. Жаўнаркевіч. Дырэктар гімназіі К. Шчасновіч.

Пачатковыя школы, бібліатэкі, чытальні могуць палучаць „Беларускія Ведамасьці" **ДАРМА**, выслаўшы толькі грошы на перасылку газэты, (30 марак на 3 месяцы).

Усіх паважаных грамадзян войтаў і солтысаў, якім пасылаюцца „Бел. Вед.", просім прысылаць нам адрасы сялян, якія таксама хочуць палучаць газэту.

Кнігі па каапэрацыі.

С. Чыжэўскі. — Як увайсьці таварыству (каапэратыву) сябрам у саюз? — 1920 г.

С. Чыжэўскі. — Рахунковасьць для вясковых і іншых невялічкіх спажывецкіх таварыстваў (каапэратываў) Выпуск III. Глаўная кніга — каса-меморыял. — 1921 г.

С. Чыжэўскі. — Першыя Крокі ураду спажывецкага таварыства (каапэратыва) — 1921 г.

С. Чыжэўскі. — У аб'яднаньні моц і іншыя апавяданьні з жыцьця беларускіх каапэратываў. — 1921 г.

С. Чыжэўскі. — Каапэратары, апавяданьне з жыцьця беларускіх каапэратываў — 1921 г.

Л. Арэхва. — Рахунковасьць для вясковых і іншых невялікіх спажывецкіх таварыстваў (каапэратываў) па упрошчанай амэрыканскай сыстэме — 1920 г.

Кнігі можна выпісаць з кніжнай крамы Віленскага Саюзу Каапэратываў (М. Пагулянка, 12) і з Беларускай Кнігарні (Вільня, Завальная, 7).

Рэдактар-выдавец М. Гарэцкі.

Друкарня „ДРУК", Субач 2